**«ЭКАНО́МІКА. КІРАВА́ННЕ. ПРАВА»**, навукова-практычны часопіс. Заснавальнік — Мінскі інстытут кіравання. Выдаецца штоквартальна з 2002 у Мінску, друкуе матэрыялы на бел., рус. і англ. мовах. Асвятляе актуальныя праблемы рыначнай эканомікі, пабудовы сац.-прававой дзяржавы, фарміравання дэмакр. грамадства, заканад. забеспячэння і абароны праву асобы, механізмаў, мадэлей і прагнозау сац.-эканам. развіцця Беларусі, непажаданых наступстваў пэўных сац.-эканам. рэформ. Папулярызуе прагрэс. канцэпцыі і навукова абгрунтаваныя падыходы у галіне кіравання, тэорыі права, удасканалення заканадаўства і правауЖывальнай практыкі. Публікуе крытыка-бібліягр. рэцэнзіі на кнігі, манаграфіі, зборнікі, а таксама справаздачы аб навук. міжнар. і рэсп. канферэнцыях, сімпозіумах і семінарах. *М.В.Суша.*

**ЭКАНО́МІКА-ГЕАГРАФІ́ЧНАЕ СТАНОВІШЧА**, сукупнасць прасторавых суадносін нас. пунктау, прадпрыемстваў і эканам. раёнаў асобных краін і іх груп да вонкавых аб'ектаў, якія маюць для іх эканам. значэнне. Э.-г.с. — катэгорыя гіст., даследуецца як працэс змен суадносін аб'ектаў пры *геаграфічным (тэрытарыяльным) падзеле працы.* Ацэньваецца як спрыяльнае і неспрыяльнае. Спрыяльнае Э.-г.с. — гэта толькі патэнцыяльная магчымасць яго выкарыстання; фактычная рэалізацыя залежыць ад канкрэтных гіст. і сац. умоў. У прасторавым аспекце адрозніваюць цэнтр., перыферыйнае, «суседскае» і інш. віды становішча, а паводле маштабу разглядаюць мікра-, меза- і макрастановішча. Інтэгральнае Э.-г.с. складаецца з уласных (пафактарных) становішчаў (напр., транспартна-геагр., палітыка-геагр.), якія аналізуюцца паасобна. Гл. таксама *Геаграфічнае становішча.*

**ЭКАНО́МІКА-МАТЭМАТЫЧНЫЯ МАДЭЛІ**, мадэлі эканам. аб'ектаў, працэсаў, пры апісанні якіх выкарыстоўваецца *матэматычнае мадэліраванне.*

Гістарычна першая такая мадэль — эканам. табліца *Ф.Кенэ* з абгрунтаваннем працэсаў стварэння, узнаўлення і пераразмеркавання грамадскага даходу (1758). Першую агульную мадэль эканомікі для знаходжання максімальна магчымага тэмпу эканам. росту і адпаведных гэтаму росту прапорцый і цэн сканструяваў *Дж.Нейман* (1937). У СССР вопыт Э.-м.м. выкарыстоўваўся для планавання і прагназіравання усіх звёнаў і узроўняў эканомікі.

Адрозніваюць дэскрыптыўныя і аптымізацыйныя Э.-м.м. Дэскрыптыўныя растлумачваюць пэўныя эканам. з'явы і працэсы, напр., мадэлі эканам. росту, канкурэнтнай эканам. раўнавагі. Да іх адносяць і прагнозныя мадэлі для розных частак эканомікі, якія грунтуюцца на матэм. статыстыцы, у прыватнасці *карэляцыйны аналіз.* Аптымізацыйныя, аптымальныя мадэлі — сістэмы ураўненняў, роўнасцей і няроўнасцей, якія акрамя абмежаванняў (умоў) уключаюць і асобага роду ураўненне (функцыянал, або *крытэрый аптымальнасці*). З дапамогай такога крытэрыя знаходзяць найлепшае рашэнне па якім-н. паказчыку, напр., мінімум затрат на матэрыялы пры зададзеным аб'ёме прадукцыі, або максімум прадукцыі (ці прыбытку) пры зададзеных абмежаваннях па рэсурсах і г.д. Аптымізацыйныя мадэлі звычайна адносяць да тыпу мадэлей *лінейнага праграмавання.* Э.-м.м., у якіх апісваецца моманты стан аб'екта, наз. статычнымі, а тыя, што паказваюць развіццё аб'екта — дынамічнымі. Вылучаюць таксама аналітычныя мадэлі (у выглядзе формул функцыянальнай залежнасці розных паказчыкаў), лікавыя (у выглядзе лікавых прыкладаў), матрычныя (у форме табліц), сеткавыя (у форме сеткавых графікаў). Прынята падзяляць Э.-м.м. на 2 групы: мадэлі, якія адлюстроўваюць пераважна вытв. аспекты эканомікі і мадэлі, якія адлюстроўваюць сац. аспекты эканомікі.

*Літ.:* Немчиков В.С. Экономико-математические методы и модели. 2 изд. М., 1963; Канторович Л.В., Горстко А.Б. Оптимальные решения в экономике. М., 1972; Иванилов Ю.П., Лотов А.В. Математические модели в экономике. М., 1979; Вилкас Э.Й., Майминас Е.З. Решения: теория, информация, моделирование. М., 1981. *М.І.Холад.*

**ЭКАНО́МІКІ І АРГАНІЗАЦЫІ СЕ́ЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ БЕЛАРУСКІ НДІ** Міністэрства сельскай гаспадаркі Беларусі, навукова-даследчая установа, якая існавала у 1957—88. Гл. у Дадатку *Інстытут аграрнай эканомікі* Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

**ЭКАНО́МІКІ І ІНФАРМАЦЫІ АГРАПРАМЫСЛОВАГА КОМПЛЕКСУ БЕЛАРУСКІ НДІ**, навукова-даследчая установа, якая існавала у 1994—99. Гл. у Дадатку *Інстытут аграрнай эканомікі* Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

**ЭКАНО́МІКІ І ЭКАНАМІ́ЧНА-МАТЭМАТЫЧНЫХ МЕТАДАЎ ПЛАНАВАННЯ НДІ** пры Дзяржаўным планавым камітэце Беларусі, навукова-даследчая установа, якая існавала у 1965—83. Гл. *Эканамічны навукова-даследчы інстытут* Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь.

**ЭКАНО́МІКС**, эканамічная тэорыя; частка эканамічнай навукі, якая вывучае тэарэт. асновы эканам. працэсаў. Тэрмін увёў у навук. ужытак англ. вучоны-эканаміст А.*Маршал* замест ранейшага паняцця *палітычнай эканоміі* і надаў яму больш практычную накіраванасць. Прадмет Э. — тэорыя попыту і прапановы, устанаўленне рыначнай раўнавагі, рыначнай канкурэнцыі, увязванне вытворцаў і спажыўцоў на рынак.

**ЭКАНО́МІЯ** (ад грэч. oikonomia загадванне гаспадаркай), стаЛовы маёнтак, від дзярж. зямельнага уладання у ВКЛ для задавальнення патрэб двара манарха і прыдворнага скарбу. Вылучаны з каралеўскіх уладанняў на падставе соймавай канстытуцыі 1589 «Ардынацыя аб каралеўскіх прыбытках Вялікага княства Літоўскага». На Беларусі з 16 ст. існавалі *Берасцейская эканомія, Гродзенская эканомія, Кобрынская эканомія,* Магілеўская Э. (гл. у арт. *Магілёўская воласць*), у 18 ст. — таксама Віцебская, Пінская і Слонімская Э.; у Літве — Аліцкая і Шавельская Э. Мелі уласную гасп. адміністрацыю, падзяляліся на губерні, войтаўствы, ключы, лясніцтвы. Кіраваліся надворным (гаспадарскім) падскарбіем ВКЛ, які са згоды сойма мог здаваць частку Э. або яе даходы (з мыта, прапінацыі, пошты і г.д.) у заставу або пажыццёвае трыманне аселай шляхце. Для кантролю за станам Э. праводзіліся *люстрацыі,* у час якіх складаліся *інвентары.* Для павелічэння сваіх прыбыткаў каралеўскі двор імкнуўся ператварыць у Э. і інш. дзярж. уладанні, што неаднойчы забараняў сойм. Пасля далучэння ВКЛ да Рас. імперыі у канцы 18 ст. Э. перайшлі у царскую казну, некаторыя падараваны прыватным асобам.

**ЭКАСЕ́З** (франц. ecossaise, danse ecossais шатландскі танец), старажытны шатландскі народны танец. Выконваўся пад акампанемент валынкі. Муз. памер 3/4, пазней 2/4. Асн. рухі — слізгаючы крок, галоп і інш. У канцы 17 ст. з'явіўся у Францыі, пашырыўся як вясёлы парна-групавы танец у хуткім тэмпе. У 1-й трэці 19 ст. набыў папулярнасць у Еўропе як разнавіднасць *кантрданса.* Муз. форму Э. выкарыстоўвалі кампазітары Л.Бетховен, Ф.Шапэн, Ф.Шуберт і інш.

**ЭКАСІСТЭ́МА** (ад *эка...* + *сістэма*), прыродны функцыян. комплекс, утвораны узаемадзеяннем жывых арганізмаў з іх асяроддзем; адкрытая тэрмадынамічная сістэма, стабільнасць якой падтрымліваецца кругаваротам рэчываў і патокамі энергіі. Асн. працэс у Э. — іх *біялагічная прадукцыйнасць,* якая праходзіць з рассейваннем ч. энергіі у форме цяпла.

Тэрмін «Э.» прапанаваны англ. батанікам А.Тэнслі (1935); яго выкарыстоўваюць у дачыненні да прыродных аб'ектаў рознага аб'ёму і складанасці: возера, лес, балота, лужына, Зямля увогуле. Характарызуецца Э. відавым складам, колькасцю асобін кожнага віду, іх біямасай, размеркаваннем і сезоннай дынамікай, суадносінамі розных трафічных груп, інтэнсіўнасцю працэсаў прадуцыравання і дэструкцыі арган. рэчыва. Размяркоўваюць Э. па геагр., фіз.-хім., трафічных умовах, відавой разнастайнасці і інш.

*Літ.:* Уиттекер Р. Сообщества и экосистемы: Пер. с англ. М., 1980; Одум Ю. Экология: Пер. с англ. М., 1986. *В.В.Маўрышчаў.*

**ЭКАТО́Н** (ад *эка...* + грэч. tonos адценне), пераходная зона паміж суседнімі *экасістэмамі.* Адметная вял. разнастайнасцю і шчыльнасцю арганізмаў, характэрных для абедзвюх экасістэм (краявы эфект).

**ЭКАТЫ́П**, экалагічны тып, экалагічная раса, група асобін пэўнага віду раслін ці жывёл, якая характарызуецца спадчыннай прыстасава-